УДК 633.82:58.006 (476.4-18)

Т. У. Сачыўка, канд. с.-г. навук (БДСГА, г. Горкі);
В. М. Босак, д-р с.-г. навук, праф. (БДТУ, г. Мінск)

# НОВЫЯ САРТЫ ВОСТРАСМАКАВЫХ КУЛЬТУР Ў БАТАНІЧНЫМ САДЗЕ БДСГА

Сёння ў калекцыі Батанічнага сада і дэндрарыя Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі налічваецца 3335 таксонаў раслін, якія належаць да 840 родаў, 1476 відаў і 1019 сартоў. Калекцыя вострасмакавых раслін уключае 58 відаў (14 сямействаў і 40 родаў), якая падзелена на 3 секцыі.

У першую секцыю ўваходзяць найбольш распаўсюджаныя вострасмакавыя культуры (цыбуля – *Allium*, базілік – *Ocimum*, мята – *Mentha*, мяліса – *Melissa*, маяран – *Majorana*, шалфей – *Salvia*, размарын – *Rosmarinus*, ісоп – *Hyssopus*, мацярдушка – *Origanum*, сатурэя – *Satureja*, чабор – *Thymus*, фенхель – *Foeniculum*, кроп – *Anethum*, сельдэрэй – *Apium*, любіста – *Levisticum*, гарчыца – *Sinapis*, хрэн – *Armoracia*, палын эстрагонавы – *Artemisia*, партулак – *Portulaca*, настурка – *Tropaeolum*, каляндра – *Coriandrum*, кмен – *Corum*, пятрушка – *Petroselinum*); у другую секцыю – рэдка выкарыстоўваемыя вострасмакавыя расліны (манарда – *Monarda*, лаванда – *Lavandula*, бядрынец – *Pimpinella*, панікніца – *Geum*, дуброўка – *Potentilla*, святаяннік – *Hypericum*, рута – *Ruta*, барага – *Borago*, пажытнік – *Trigonella*, шматкалоснік – *Agastache*, аксаміткі – *Tagetes*); у трэцюю секцыю – перспектыўныя вострасмакавыя культуры (кацямятка – *Nepeta*, наготкі – *Calendula*, піжма – *Tanacetum*, чарнушка – *Nigella*, герань – *Geranium*, рамонак – *Matricaria*).

У выніку даследаванняў з калекцыяй вострасмакавых раслін выдзелены па комплексу гаспадарча карысных прыкмет, перададзены ў Дзяржаўнае сортавыпрабаванне і зарэгістраваны з уключэннем у Дзяржаўны рэестр сартоў і драўняна-хмызняковых парод Рэспублікі Беларусь з рэкамендацыяй для вырошчвання ў прысядзібных гаспадарках тры сарты базіліка звычайнага (*Ocimum basilicum* L.) «Магия», «Володар» і «Настена», адзін сорт базіліка танкакветкавага (*Ocimum tenuiflorum* L.) «Источник», адзін сорт цыбулі шмат'яруснай (*Allium*×*proliferum* (*Allium cepa* × *Allium fistulosum*)) «Узгорак», адзін сорт цыбулі духмянай (*Allium odorum* L.) «Водар», адзін сорт барага (*Borago officinalis* L.) «Блакіт» і адзін сорт герані буйнакарэнішчавай (*Geranium macrorrhizum* L.) «Танюша».